2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 384. – Воп. 2. – Спр. 4.
3. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А. А. Каваленя [и др.]. – Минск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.
4. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 2073. – Воп. 1. – Спр. 99.
5. НАРБ. – Ф. 381. – Воп. 1. – Спр. 15.
6. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 2135. – Воп. 2. – Спр. 45.
7. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. – Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 1.
8. Неизвестная черная книга. Свидетельства очевидцев о катастрофе советских евреев (1941–1944) / сост. Ш. Краковский. – Москва, Иерусалим, 1993. – 463 с.

Витебский государственный технологический университет

УДК 811.161.3’33

# СУЧАСНЫЯ НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІНГВІСТЫКІ

***Лебедзева С.В., ст. выкл.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*

*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разгледжаны сучасныя напрамкі развіцця беларускага мовазнаўства. Адлюстравана дзейсная прырода мовы і яе ўключанасць у працэсы жыццядзейнасці чалавека і грамадства. Прааналізаваны погляды на мову з пункту гледжання яе ўдзелу ў пазнавальнай дзейнасці чалавека. Адзначана адпаведнасць лінгвістыкі сучасным напрамкам лінгвістычных даследаванняў у свеце.*

Ключавыя словы: лінгвістыка, моўная адзінка, гендэрная лінгвістыка, кагнітыўная лінгвістыка, канцэпт, этналінгвістыка, менталітэт.

Мовазнаўства знаходзіцца ў працэсе пастаяннага руху, аб чым сведчыць змяненне разумення паняцця самой мовы. У першай палове XX стагоддзя лінгвістыку займалі праблемы мовы як дастаткова добра ўпарадкаванай сістэмы адносна аўтаномных моўных адзінак, гэта значыць праблемы фаналогіі, лексікалогіі, марфалогіі, сінтаксісу, а потым і семантыкі. Безумоўна, фанетыка і фаналогія, марфалогія, сінтаксіс, лексікалогія і семантыка ў іх сінхранічным і дыяхранічным аспектах утвараюць у сукупнасці фундамент лінгвістычнага ведання. Раней у цэнтры ўвагі лінгвістаў стаялі самі моўныя сродкі, а зараз дакладна ўсвядомлена, што ўсе гэтыя моўныя сродкі выступаюць у якасці фармальных апаратараў, з дапамогай якіх чалавек ажыццяўляе працэс зносін.

Пералом у свядомасці лінгвістаў звязаны са з’яўленнем шэрагу новых дысцыплін, што адлюстроўваюць дзейсную прыроду мовы і яе ўключанасць у працэсы жыццядзейнасці чалавека і грамадства ў цэлым. Новыя сацыяльныя тэндэнцыі раней ці пазней пранікаюць у мову і маўленне. Сярод дысцыплін, што ўзніклі на стыку з лінгвістыкай, выяўляюцца сацыялінгвістыка, псіхалінгвістыка, этналінгвістыка, кагнітыўная лінгвістыка, гендэрная лінгвістыка. Спынім сваю ўвагу на некаторых з іх.

Даследаванні ўзаемаадносін мовы і гендэра ў постсавецкім мовазнаўстве пачалі актыўна распрацоўвацца ў другой палове 1990-х гг. Раней мовазнаўцы старанна апісвалі моўны матэрыял, але не прапаноўвалі гендэрнага аналізу даследаваных адзінак. Па сваёй сутнасці гендэрныя даследаванні даюць магчымасць даследаваць звыклы лінгвістычны матэрыял з новага боку. Гендэр у мове – гэта не маркер полу, а механізм рэгулявання ўладных адносін, каторыя выяўляюцца ў наяўнасці ці адсутнасці пэўных адзінак, іх нейтральнасці ці наадварот эмацыянальнай і стылістычнай афарбоўкі і г. д. Прычым гендэр не выступае як ізаляваная катэгорыя, ён «убудаваны» ў розныя сацыяльныя інстытуты такія, як сям’я, узрост, адукацыя, грамадзянства і г. д. Гэта актыўная катэгорыя, тое, што называе, замацоўвае і «падказвае» стандарты нарматыўнасці і становішча індывіда ў адносінах да яе. Катэгорыя, што «прымушае» нас – носьбітаў мовы – думаць сістэмай стэрэатыпаў, якія прадпісваюць абодвум палам цэлы шэраг нормаў, адхіленне ад якіх караецца грамадскім асуджэннем. Адпаведныя моўныя выразы (гэта не жаночая справа, мужчынская размова, сапраўдны мужчына і іншыя) прадпісваюць носьбітам не толькі даволі выразна акрэсленыя ўяўленні аб абодвух палах, але і «стымулююць» пэўныя паводзіны ў межах гэтых уяўленняў. Іншымі словамі, гендэрна маркіраваныя словы і выразы лінгвістычна даюць або

пазбаўляюць права на доступ да сацыяльных рэсурсаў, якія могуць выражацца як сімвалічна, так і цалкам «матэрыяльна», напрыклад, пры прыёме на працу, размеркаванні ўлады ў грамадстве.

Сёння ўзнікла неабходнасць паглядзець на мову і з пункту гледжання яе ўдзелу ў пазнавальнай дзейнасці чалавека. Мова – сродак перадачы думкі, аформленай праз структуру мовы. Веды, якія выкарыстоўваюцца пры гэтым, не з'яўляюцца толькі ведамі пра мову. Гэта таксама веды пра сусвет, пра сацыяльны кантэкст, веды аб прынцыпах моўных зносін і г. д. Пытаннямі, як захоўваюцца нашы веды, як яны структураваны ў мове ў працэсе камунікацыі, займаецца кагнітыўная лінгвістыка. Важнейшым аб'ектам даследавання ў кагнітыўнай лінгвістыцы з'уляецца канцэпт. Канцэпты – гэта ментальныя сутнасці, якія маюць імя ў мове і адлюстроўваюць культурна-нацыянальнае ўяўленне чалавека пра свет. Канцэпт – гэта і тое, пасродкам чаго звычайны чалавек сам уваходзіць у культуру, а ў некаторых выпадках і ўплывае на яе. Ключавымі канцэптамі культуры называюць галоўныя адзінкі карціны свету, канстанты культуры, якія валодаюць значнасцю як для асобнай моўнай асобы, так і для лінгвакультурнай супольнасці ў цэлым. У выніку кагнітыўнай дзейнасці ствараецца сістэма сэнсаў, якія адносяцца да таго, што індывід ведае, думае пра свет. Даследаванне таго, як чалавек аперыруе сімваламі, усведамляючы свет, і сябе ў свеце, аб'яднала лінгвістыку з іншымі дысцыплінамі, якія вывучаюць чалавека і грамадства. Мова свядомасці, значэнне слова – гэта форма фіксацыі грамадскага вопыту людзей, ведаў пра свет. Менавіта мова забяспечвае найбольш натуральны доступ да свядомасці і разумовых працэсаў.

У апошнія гады ў грамадстве паступова страчваецца цікавасць да традыцыйнай народнай культуры. Між тым навукоўцы актыўна даследуюць гэтую з'яву, якая імкліва знікае ў свеце інфармацыйных тэхналогій, якая захоўвае памяць пра вытокі народа, этнасу. Этналінгвістыка – спецыяльная дысцыпліна, якая вывучае менавіта гэтыя праблемы, з'явілася не так даўно. Аб'ектам вывучэння этналінгвістыкі з'уляецца не толькі мова, але і іншыя формы і субстанцыі, у якіх выяўляе сябе калектыўная свядомасць, народны менталіэт, складзеная ў тым альбо іншым этнасе «карціна свету», гэта значыць уся народная культура, усе яе віды, жанры і формы – вербальныя (лексіка і фразеалогія, фальклорныя тэксты), акцыянальныя (абрады), ментальныя (вераванні). Цэнтральнымі для этналінгвістыкі з'яўляюцца наступныя дзве цесна ўзаемазвязаныя паміж сабой праблемы: якім чынам, з дапамогай якіх сродкаў і ў якой форме ў мове знаходзяць адлюстраванне культурныя (бытавыя, рэлігійныя, сацыяльныя і інш.) уяўленні народа, што гаворыць на гэтай мове, пра навакольны свет і пра месца чалавека ў гэтым свеце; якія формы і сродкі зносін – у першую чаргу, моўных зносін – з'яўляюцца спецыфічнымі для дадзенай этнічнай ці сацыяльнай групы? Асноўнымі напрамкамі ў беларускай этналінгвістыцы з'яўляюцца наступныя: вывучэнне культурнай і абрадавай тэрміналогіі (Ф. Д. Клімчук, В. В. Шэпелевіч, Г. А. Цыхун, М. П. Антропаў, Р. М. Кавалёва), арэалагічная праблематыка этналігвістычнай накіраванасці (Ф. Д. Клімчук), фальклорныя элементы ў фразеалогіі сучасных славянскіх моў (К. М. Гюлумянц). Падчас работы XV Міжнароднага з'езда славітаў (г. Мінск, 2013 г.) адбылася прэзентацыя праекта «Беларускі фальклорна-этналінгвістычны атлас: гісторыя праекта, першыя вынікі» (мадэратар: М. П. Антропаў; удзельнікі: Т. М. Аліферчык, А. М. Боганева, Ц. В. Авілін).

Цалкам заканамерна і зразумела, што акадэмічная лінгвістыка засведчыла сваю адпаведнасць сучасным напрамкам лінгвістычных даследаванняў у свеце. Само жыццё акрэслівае новыя гарызонты для вывучэння адзінак моўнай сістэмы, задае патрэбны вектар развіццю беларускага мовазнаўства на пачатку XXI стагоддзя.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Лукашанец, А. А. Беларуская мова і акадэмічнае мовазнаўства ў пачатку XXI стагоддзя / А. А. Лукашанец // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2014. – № 1. – С. 66 – 73.
2. Маслова, В. А. Когнитивная лингвистика: Учебное пособие / В. А. Маслова. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 256 с.
3. Антропов, Н. П. Основные направления белорусской лингвистики / Н. П. Антропов // Славяноведение. – 2008. – № 4. – С.89 – 103.
4. Kedron, K. Genderove aspekty ve slovanske frazeologii (na materialu belorustiny, polstiny a cestiny) / K. Kedron. – Praha : Karolinum, 2014.

Витебский государственный технологический университет

5. Першай, А. Семантика пола: репрезентация гендерных отношений во фразеологии. / А. Першай . – Вильнюс : Изд-во Европейского гуманитарного университета, 2014.

УДК 32.001

# ИГРОВОЙ СПОСОБ МОДЕЛИРОВАНИЯ ПОЛИТИЧЕСКОЙ РЕАЛЬНОСТИ

***Исаченко А.В., ст. преп.***

*Витебский государственный технологический университет,*

*г. Витебск, Республика Беларусь*

Реферат. *В статье представлена игра как эффективная политическая технология, характерная для современного политического процесса. Показаны возможности игры в процессе политического конструирования. Дана структура игры.*

Ключевые слова: политика, политическая игра, политические технологии, политические конфликты.

Игра пронизывает основные сферы человеческого бытия. Она является значимым и эффективным способом моделирования социальных объектов: от личности до социальной реальности. Особую актуальность игра приобретает в настоящее время в политической науке, так как она сегодня выступает и как самостоятельная технология, и как составляющая различных политических процессов. Игра представляет собой способ разрешения конфликтов, кризисных ситуаций, проведения переговоров. В целом, возможности игры достаточно многогранны. Игра представляет собой способ конструирования социального пространства и практик. Она нацелена на удовлетворение духовных и социальных потребностей человека.

Игровые механизмы присущи различным этапам становления общества. Так еще такие мыслители, как Платон и Аристотель отмечали практическую значимость игры.

Серьезной исследовательской проблемой игра становится лишь в XVII веке в работах Ф. Шиллера, Й. Гете. Так Ф. Шиллер понимал игру как способ социализации человека, реализации своего потенциала. Й. Гете полагал, что субъектом игры может быть не только человек, но и сама природа. С конца XVIII века игра начала включаться в военно-политическую сферу, она становится неотъемлемой частью дипломатии. Современные концепции игры приходятся на вторую половину XIX - нач. XX веков. В это время были сформированы научные подходы к пониманию игры как многофункциональному феномену. В этом понимании особый вклад внесли Г. Спенсер, З. Фрейд, Ж.-П. Сартр, Й. Хейзинг и др.

Изучение игры велось в разных аспектах: философском, социологическом, психологическом, культурологическом и др. Политическая сфера общества отличается от других сфер общества. Она представляет собой регулирующую и контролирующую сферу. При введении в политическое пространство игровых механизмов, возможности ее существенно увеличиваются.

Игры в политике несут в себе обширную информационную нагрузку и практическую значимость. Среди политических игр можно выделить: оппозиционные, предвыборные, властные, партийные, военные, информационные, агитационные и др.

Правила игры в политической сфере жестко детерминированы. Они четко фиксируются в законодательных актах, среди которых: указы, протоколы, ритуалы, акты.

Само политическое пространство это спланированное театральное действие. Исходя из того, что здесь задействованы такие атрибуты, как власть, собственность, ставки, как правило, возрастают.

К основным субъектам политической игры относят участников, обладающих особым статусом это – лидер, оппонент, аналитик, оппозиционер, вождь. Но игра представляет собой пространство в котором участвуют не только политики, но и социальные группы, государства, несколько государств. Примером может выступать события в Сирии или в Украине. В эту политическую игру втянуты различные государства, где каждому отводится своя роль.

Для того, чтобы занять доминирующее положение и добиться существенного преимущества необходимо обладать большими ресурсами среди которых: экономические,

Витебский государственный технологический университет